**Сяргей Токць**
(Гародня)

## Лёс беларускага настаўніка

Беларускі нацыянальны рух у першай палове XX ст. развіваўся ў вялікай ступені дзякуючы самаадданай працы мясцовых дзеячаў, імёны большасці з якіх сёння, на вялікі жаль, забытыя. Да іх ліку належыць і Васіль Сіткевіч, беларускі настаўнік са Скідзельшчыны (1896–1970). Ён нарадзіўся ў 1896 г. у невялікай вёсачцы Жалабаты Мост ці Мастаўляны Скідзельскай воласці ў сям'і Георгія і Дарыі з Фурманаў. Тапонім Жалабаты Мост узгадваецца яшчэ ў апісанні *Гродзенскай каралеўскай эканоміі* за 1558 г. З якога часу там пасяліліся людзі, дакладна невядома. У 19 ст. побач пралягаў гасцінец, была карчма, якая належала да казённага маёнтка Жыдомля, аддадзенага ў карыстанне шляхціца Парчэўскага. У афіцыйных дакументах гэты маёнтак называўся *Раўкоўскае лавецтва*, паводле вёскі Раўкі. Жалабаты Мост лічыўся выселкам з гэтай вёскі. Жыхары Раўкоў у інвентарным апісанні 1558 г. названыя *псярцамі.* Іх павіннасцю была гадоўля паляўнічых сабак для вялікага князя літоўскага. У *Ардынацыі каралеўскіх пушчаў* за 1637 г. раўкоўцы далучаны да саслоўнай групы *сялян-стральцоў* (вартаўнікоў каралеўскай пушчы). Стральцы падпарадкоўваліся адміністрацыі лоўчага вялікага князя літоўскага і павінны былі ўдзельнічаць у арганізацыі палявання для гаспадара дзяржавы.

Але ў 19 ст. былыя стральцы ўжо практычна нічым не адрозніваліся ад іншых сялян і таксама мусілі хадзіць на паншчыну. У 1869 г. у часе рэформы дзяржаўнай вёскі была праведзена люст-

рацыя сялянскіх надзелаў Раўкоўскай грамады, да якой належалі і жыхары Жалабатага Маста. У выніку гэтай люстрацыі ўсе гаспадары атрымалі ўчасткі зямлі прыкладна па 15 дзесяцін. Сярод іх знаходзім Якуба Лявонцьевіча і Міхала Антонавіча Сіткевічаў. Міхал Антонавіч і быў дзедам Васіля Сіткевіча.

Зямельныя надзелы сялян у парэформенны час вельмі хутка драбіліся ў выніку імклівага росту насельніцтва. Гэта вяло да малазямелля і канфліктаў паміж сваякамі на грунце раздзелу спадчыны. Бацька Васіля Сіткевіча, Георгій Міхайлавіч, таксама судзіўся напачатку 20 ст. з-за зямлі са сваякамі. Дзякуючы гэтаму судоваму працэсу захаваліся вельмі цікавыя дакументы, якія захоўваюцца ў сына Васіля Сіткевіча, Юрыя. Паколькі судовая цяганіна вымагала сродкаў, Георгі Сіткевіч вырашыў звярнуцца да ўладаў, каб дзяржава ўзяла на сябе ўсе выдаткі. Гэта дазвалялася законам у выпадку беднасці. І Сіткевіч здабыў у раўкоўскага вясковага старасты адпаведную паперу. Аднак судовая палата адмовіла прасіцелю, палічыўшы, што ён не належыць да ліку беднякоў. І сапраўды, як можна меркаваць на падставе вопісу маёмасці, Сіткевіч быў гаспадаром зусім не бедным. Ён нават набываў самыя сучасныя прылады земляробчай працы. Справа настойлівага селяніна дайшла аж да Вільні, але дазволу судзіцца за кошт дзяржавы ён так і не атрымаў. Таксама невядома, чым урэшце завершылася яго спрэчка са сваякамі. Такія спрэчкі на грунце малазямелля былі ў тагачаснай беларускай вёсцы справай самай звычайнай, але выратаваць ад беднасці нікога ўжо не маглі.

Некаторыя вяскоўцы бачылі выхад у навуцы для сваіх сыноў. Гэта давала магчымасць стаць настаўнікам, дробным чыноўнікам, фельчарам і г.д. Бацька Васіля Сіткевіча быў непісьменным, але вельмі рэлігійным чалавекам. Як сведчыць вопіс яго маёмасці, у хаце налічвалася ажно 20 праваслаўных абразоў. Гэта было не зусім звычайным для тагачаснай вёскі, сярод жыхароў якой усё болей пашыраліся скептычныя настроі адносна царквы і духавенства. Старэйшага брата Васіля, Пятра, які вучыўся на псаломшчыка ў Жыровічах і быў вельмі рэлігійным чалавекам, у вёсцы называлі *свяценькім*.

Георгій Сіткевіч не шкадаваў сілаў і сродкаў на навуку свайго малодшага сына. Васіль спачатку скончыў народнае вучылішча ў мястэчку Скідзель, а ў 1913 г. атрымаў атэстат Мількаўшчынскага двухкласнага царкоўна-прыходскага вучылішча. Пасля гэтага 17-гадовы юнак, як успамінае Юры Васільевіч, паехаў у далёкі Санкт-Пецярбург, дзе экстэрнам здаў эк-

замен на званне народнага настаўніка і 16 студзеня 1914 г. у канцылярыі Папячыцеля Санкт-Пецярбургскай навучальнай акругі атрымаў спецыяльнае пасведчанне. Уражвае смеласць сялянскага хлопца, які едзе ў вялікі незнаёмы горад, у якім Сіткевічы не мелі ні сваякоў, ні добрых знаёмых.

Хаця ўжо пачалася першая сусветная вайна, са студзеня па кастрычнік 1915 г. Васіль Сіткевіч працаваў народным настаўнікам у вёсцы Малая Рагозніца Ваўкавыскага павета. Але неўзабаве сям'я Сіткевічаў, як і большасць праваслаўных жыхароў Гарадзеншчыны выехала ў бежанства. Раўкоўскія сяляне апынуліся ў самых розных кутках вялізнай імперыі. Сіткевічам пашанцавала, таму што іх накіравалі ў цёплы і даволі заможны Крым. Тут Васіль Сіткевіч пачаў працаваць з лістапада 1915 г. настаўнікам Кіргіз-Казанскага пачатковага земскага вучылішча. Займеў добрых сяброў сярод мясцовай татарскай моладзі. Летам 1916 г. вучыўся на настаўніцкіх курсах у Сімферопалі.

Рэвалюцыя, а затым і грамадзянская вайна выклікалі рэзкае пагаршэнне ўмоў жыцця. Па словах Юрыя Сіткевіча ў часе эпідэміі халеры ў Крыму памерлі Георгій Сіткевіч і яшчэ некалькі яго блізкіх сваякоў. А ў 1922 г. сям'я Сіткевічаў вярнулася на радзіму. Тут ужо была новая польская ўлада, прадстаўнікі якой без асаблівай радасці сустракалі бежанцаў-беларусаў. Васіль Сіткевіч пачаў даваць прыватныя ўрокі. Выкладаў на беларускай і расійскай мовах. А ў верасні 1924 г., вывучыўшы польскую мову, уладкаваўся на працу ў дзяржаўную пачатковую школу ў вёсцы Стральцы Луненскай гміны. Праз год быў пераведзены ў маёнтак Жараслаўка Жыдамлянскай гміны.

У тыя гады ў Заходняй Беларусі віравала палітычнае жыццё. Летам 1926 г. пачалі імкліва ўзнікаць у вёсках Гарадзеншчыны гурткі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Гэтая партыя, якая вылучыла вельмі радыкальную сацыяльную праграму і рашуча выступала супраць нацыянальнай палітыкі польскіх уладаў на беларускіх землях, карысталася велізарнай папулярнасцю сярод вясковых жыхароў Скідзельшчыны. Тут у вельмі хуткім часе паўстала 18 гурткоў. У многіх вёсках гэтай гміны ўсё мужчынскае насельніцтва ўступіла ў шэрагі БСРГ. У Раўках гурток Грамады афіцыйна паўстаў 10 жніўня 1926 г. Цікава, што ў гэтай вёсцы ўжо існавала ячэйка польскай партыі „Пяст". Але яе сябры ў поўным складзе ўступілі ў Грамаду і нават напісалі зварот у газету „Народная справа". Некалькі гаспадароў у Раўках выступалі супраць Грамады, падтрымлі-

валі паланафільскага беларускага дзеяча Паўлюкевіча і нават ездзілі на з'езд яго партыі ў Вільню[1]. Гэтыя факты сведчаць пра вельмі высокую ступень палітызаванасці сялянскага насельніцтва.

Пасля забароны Грамады ў канцы 1926 г. і далейшага разгрому яе мясцовых гурткоў, на іх месцы паўсталі структуры Таварыства Беларускай Школы. Толькі ў Скідзельскай гміне ўзнікла 10 гурткоў ТБШ. У Раўках гурток быў утвораны 10 снежня 1926 г. і налічваў 27 сяброў. У снежні 1926 г. раўкоўскія актывісты сабралі подпісы на адкрыццё беларускай школы і аднеслі іх у праўленне гміны. Як пісала газета „Наша справа", гмінны пісар Вялічка накінуўся на раўкоўцаў са словамі: „За краты вас пасадзіць, а не даць беларускую школу"[2]. А на калядныя святы 1927 г. жыхары Раўкоў сабралі 50 злотых на адкрыццё беларускай бібліятэкі ў сваёй вёсцы[3]. Вясной 1927 г. гурток ТБШ у Стральцах, суседняй з Раўкамі вёсцы, заснаваў бібліятэку-чытальню імя Антона Луцкевіча. Гэтая бібліятэка ў красавіку 1927 г. налічвала ўжо 70 кніг, прычым тры кнігі для яе ахвяраваў сам Антон Луцкевіч[4].

Вельмі папулярнымі былі сярод сялянскага насельніцтва Скідзельскай гміны тэатральныя пастаноўкі на беларускай мове, якія звычайна збіралі ўсіх насельнікаў вёсак ад малых да старых. Напрыклад, у Стральцах 2 чэрвеня 1927 г. былі пастаўлены п'есы Л. Родзевіча „Пасланец", „Конскі партрэт", „Збянтэжаны Саўка". 12 чэрвеня ў Раўках адбылася пастаноўка твора М. Кудзелькі „Мікітаў лапаць" і „У іншым шчасці няшчасце схавана". У кастрычніку 1927 г. сябры гуртка ТБШ з вёскі Пяшчанка сарганізавалі ў Раўках у памяшканні былой школы аматарскую пастаноўку драмы „Дрыгва" Францішка Аляхновіча[5].

Васіль Сіткевіч у склад мясцовых гурткоў БСРГ і ТБШ афіцыйна не ўступіў. Напэўна апасаўся страціць працу настаўніка, што было б у такім выпадку непазбежным. Але з многімі мясцовымі актывістамі ён падтрымліваў вельмі добрыя, сяброўскія стасункі. І ў першую чаргу з Піліпам Кізевічам, які паходзіў са Стральцоў, але жыў у Гародні. Піліп Кізевіч быў сакратаром Гарадзенскага павятовага камітэта БСРГ, а пазней скарбнікам

1 „Народная справа", № 25, 16.10.1926.
2 „Наша справа", № 6, 15.12.1926.
3 „Наш голас", № 7, 01.02.1927.
4 „Наша праўда", № 7, 22.04.1927.
5 „Праца", № 3, 12.11.1927.

і старшынёй Гарадзенскай акруговай управы ТБШ. У Юрыя Васільевіча Сіткевіча захаваліся паштоўкі на беларускай мове, якія Піліп Кізевіч дасылаў яго бацьку з Гародні і Беластока.

У саміх Стральцах лідэрам беларускага руху быў сваяк Піліпа Кізевіча, Міхал Кізевіч. Ён займаў пасаду намесніка войта Скідзельскай гміны. Разам з іншымі раднымі-грамадоўцамі дамагаўся пераводу гміннага справаводства на беларускую мову і замены на Скідзельшчыне польскай школы на беларускую. Міхал Кізевіч актыўна ўдзельнічаў у працы Гродзенскай акруговай управы ТБШ. У кастрычніку 1928 г. ён быў абраны дэлегатам на з'езд ТБШ у Вільню. А на пачатку 1930 г. Міхал Кізевіч спрабаваў, паводле звестак паліцыі, наладзіць у Скідзелі выданне лакальнага беларускага часопіса[6].

У верасні 1928 г. Васіль Сіткевіч дамогся пераводу з Жараслаўкі менавіта ў Стральцы Скідзельскай гміны, якія знаходзіліся побач з Раўкамі. У 1929 г. ён ажаніўся з настаўніцай Францішкай Антонаўнай Скерсь, якая выкладала ў Жараслаўскай пачатковай школе. Францішка Скерсь паходзіла з каталіцкай сям'і з-пад Жалудка. Вянчанне маладых адбылося ў касцёле. Прычым, як узгадвае Юрый Сіткевіч, ксёндз настойліва прапаноўваў яго бацьку змяніць веравызнанне. Васіль Сіткевіч нават вымушаны быў звяртацца ў высокія касцельныя інстанцыі, каб дамагчыся дазволу на вянчанне без „паламання веры”. Пры ўсім гэтым ён не быў асабліва рэлігійным чалавекам, у царкве бываў нячаста, а да праваслаўнага духавенства ставіўся даволі скептычна. У 1932 г. Сіткевічы пабудавалі ў Раўках хату.

Пасля парламенцкіх выбараў 1928 г., якія завершыліся перамогай праўрадавага блока, пачынаецца заняпад беларускага нацыянальнага руху. У 1930 г. спынілі сваю дзейнасць апошнія гурткі ТБШ на Скідзельшчыне. Гурток ТБШ у Раўках афіцыйна самараспусціўся 22 жніўня 1930 г., хаця ў рэчаіснасці не працаваў ужо даўно. Ячэйкі КПЗБ дзейнічалі ў падполлі, аднак праблемы беларускай культуры і мовы былі для іх другараднымі. Капэзэбоўцы ў асноўным пашыралі сярод сялян байкі пра тое, як добра жывецца працоўным людзям у СССР і заклікалі землякоў не падпарадкоўвацца ўладам, што б тыя не рабілі. А польскія ўлады таксама пачыналі дзейнічаць усё больш жорстка. Кожны беларус, які працаваў у дзяржаўных структурах, выклікаў падазрэнне ў палітычнай нядобранадзейнасці.

[6] Archiwum Państwowe w Białymstoku, akta Urzędu Wojewódzkiego w Białymstoku, sygn. 41, k. 52.

У 1934 г. у навучальных установах Скідзельскай гміны працавалі 34 настаўнікі. І сярод іх быў толькі адзін беларус – Васіль Сіткевіч. Мясцовы паліцэйскі камендант пісаў пра яго ў сваёй справаздачы: „(...) з увагі на тое, што паходзіць з тутэйшага абшару і з'яўляецца ўласнікам зямлі, мае сярод ваколічных мяшканцаў, якія з палітычнага пункту гледжання ўяўляюць непрыхільны да Дзяржавы элемент, вялікі давер". А таму, падсумоўваў паліцэйскі чыноўнік: „(...) школа ў вёсцы Стральцы да таго часу, пакуль кіраўніком яе з'яўляецца Сіткевіч, як пляцоўка (мелася на ўвазе паланізацыі – С. Т.) страчаная"[7].

У віну Сіткевічу ўлады ставілі і тое, што жыхары вёсак Мастаўляны (у той час старую назву Жалабаты Мост замянілі на Мастаўляны) і Гарашкі (выселак вёскі Раўкі) адмовіліся плаціць падаткі, і тое, што моладзь вёскі Стральцы арганізавала ўрачыстае шэсце на 1 траўня 1932 г. Трэба прызнаць, што Стральцы сапраўды належалі да ліку найбольш скамунізаваных вёсак Гарадзеншчыны. Тут актыўна дзейнічала ячэйка КПЗБ. У гэтую ячэйку паліцыя здолела ўкараніць сваіх канфідэнтаў. Аднаго з іх, які меў псеўданім Ян Мізевіч, кэпээзэбоўцы выкрылі і пастанавілі забіць. Але па іроніі лёсу даручылі такое заданне другому канфідэнту, які і паведаміў пра гэта ў паліцыю. Мізевіч быў вымушаны тэрмінова з'ехаць з вёскі ў Гродна[8]. Вось у такіх умовах настаўнічаў у Стральцах Васіль Сіткевіч.

У красавіку 1935 г. яго перавялі на настаўніцкую працу ў Іўе, дзе большасць жыхароў належала да каталіцкага веравызнання. Гэтакі ход нярэдка выкарыстоўваўся ўладамі адносна настаўнікаў беларускага паходжання. Лічылася, што ў каталіцкім асяроддзі яны не змогуць эфектыўна праводзіць беларускай нацыянальнай агітацыі. А ў студзені 1936 г. Васіля Сіткевіча ўвогуле звольнілі з працы. Праўда, пры гэтым яму прызначылі даволі някепскую, прынамсі па мерках аднавяскоўцаў, пенсію. Апроч таго Сіткевічу належала больш 12 га зямлі ў Раўках. Гэта дазваляла жыць адносна заможна. Але, як успамінае Юрый Сіткевіч, бацька перайшоў ужо ў адкрытую апазіцыю да польскай улады, яшчэ больш зблізіўся з кэпээзэбоўцамі, набыў першы ў вёсцы радыёпрыёмнік, па якому разам з сябрамі слухаў перадачы савецкага радыё. Юрый Сіткевіч таксама ўзгадвае, што паліцыя яго бацьку аднойчы арыштавала, прычым Васіль Сіт-

[7] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 24, в. 1, с. 70, А. 21.

[8] Там жа, арк. 119.

кевіч быў нават адпраўлены ў сумна вядомыя Лукішкі. Даказаць нейкую канкрэтную віну Сіткевіча паліцыі не ўдалося, таму ён неўзабаве апынуўся на свабодзе.

Калі ў верасні 1939 г. Германія напала на польскую дзяржаву, а ўслед за гэтым і Савецкая Армія рушыла на заходнебеларускія землі, у Скідзелі выбухнула паўстанне супраць польскай улады, арганізаванае мясцовымі капэзэбоўцамі. Васіль Сіткевіч далучыўся да паўстанцаў. Як успамінае Юрый Васільевіч, бацька зайшоў дахаты з вінтоўкай у руках і чырвоным бантам на грудзях.

Паўстанцы захапілі дзяржаўныя ўстановы ў Скідзелі, раззброілі і арыштавалі паліцэйскіх і вайскоўцаў. Але адкрыты бой з аддзелам карнікаў, якія прыбылі з Гародні па выкліку мясцовых паліцэйскіх, прайгралі. Васіль Сіткевіч і яшчэ некалькі дзесяткаў чалавек патрапілі ў палон. Паводле ўспамінаў Юрыя Васільевіча, Васіля Сіткевіча ўдарылі штыком, выбілі зубы. Некаторых паўстанцаў пасля катаванняў тут жа расстралялі. Астатніх палонных пачалі канваіраваць у Гародню. Але, калі па дарозе наляцелі савецкія самалёты, дык канваіры разбегліся, а вязні нечакана аказаліся вольнымі. Яны вярнуліся ў Скідзель, дзе злучыліся з тымі, хто пазбегнуў арышту і зноў узброіліся. Разам з перадавым атрадам Чырвонай Арміі скідзельскія паўстанцы ў той жа дзень выбівалі з мястэчка ўжо рэгулярны атрад польскага войска ротмістра Вішаватага[9].

У першыя дні пасля змены ўлады жыццё ў вёсках Скідзельшчыны зноў завіравала. Сялян ахапіла пачуццё сапраўднай эйфарыі. Юрый Сіткевіч узгадвае:

> У Раўках кожны вечар вяскоўцы збіраліся ў школе, спявалі песні, танцавалі, зладзілі сцэну, на якой падрыхтавалі пастаноўку п'есы Францішка Аляхновіча „Чорт і баба”. Мой бацька вярнуўся да настаўніцкай працы. Яго прызначылі дырэктарам Раўкоўскай школы. Навучанне было пераведзена на беларускую мову. Праўда, аднойчы здарыўся такі выпадак. У школе партрэты Сталіна і іншых савецкіх правадыроў памясцілі ў старыя рамкі, не выкінуўшы папярэдне адтуль партрэты Пілсудскага, Рыдз-Сміглага і г.д. І нехта данёс пра гэта раённаму начальству. Памятаю, што хтосьці з раённых начальнікаў заявіў тады майму бацьку: „Так будьте же директором, а не тряпкой!”. Напэўна, ён меў на ўвазе стаўленне дырэктара школы да сваіх падначаленых.

[9] M. Wierzbicki, *Powstanie skidelskie 1939 r.*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, nr 7, 1997, s. 87–88.

Напачатку людзі шчыра верылі, што настае тое шчаслівае жыццё, якога так доўга чакалі і дзеля якога столькі выцярпелі. Арышты і вываз на ўсход асаднікаў, былых паліцэйскіх і іншых польскіх чыноўнікаў разам з іх сем'ямі ўспрымаліся большасцю мясцовых жыхароў як справядлівая расплата. Але савецкая рэчаіснасць усё больш выразна пачынала выяўляць свае цёмныя бакі. Заняпадае прыватны гандаль, з крамаў знікаюць тавары, на сялян, як у прыгонныя часы, накладваюць розныя натуральныя павіннасці, усё болей настойліва прапаноўваюць уступаць у калгасы. Калгас утвараецца і ў Раўках. Як дырэктар школы вымушаны быў аддаць калгасу сваю зямлю Васіль Сіткевіч. З яго свірана зрабілі калгасны склад. Вельмі хутка раўкоўцы спазналі „перавагі" новага спосабу гаспадарання, калі ўсё прыходзілася рабіць па камандзе зверху. А за выпадкова кінутае супраць новага парадку слова пачынаюць знікаць звычайныя людзі. Адна недарэчная гісторыя з партрэтам правадыра магла паламаць лёс некалькіх людзей.

Таму, калі зноў выбухнула вайна і імкліва пакацілася на ўсход, то ў Раўках прыход немцаў сустрэлі па-рознаму. У часе акупацыі людзі, якія сталі закладнікамі супрацьстаяння дзвюх таталітарных сістэм, мусілі выжываць, а дзеля гэтага працаваць і вучыцца. Юрый Сіткевіч успамінае:

> Паехаўшы аднойчы па справах у Гродна бацька заўважыў на вуліцы шыльду з надпісам „Беларускі камітэт". Вырашыў зайсці. Там пазнаёміўся з беларускімі актывістамі, якія прапанавалі яму аднавіць працу Раўкоўскай школы. Аддзяленне Беларускага камітэта неўзабаве ўзнікла і ў Скідзелі. Бацьку прызначылі інспектарам беларускіх школ па Скідзельскай воласці. Немцы не мелі часу і магчымасцяў, каб асабліва сачыць за навучаннем у школах. Адзінае, што патрабавалі, гэта каб не было камуністычнай агітацыі. Дазвалялася нават выкарыстоўваць некаторыя савецкія падручнікі. Дзеці, калі прыходзілі ў школу, дык віталіся з настаўнікам воклічам: „Жыве Беларусь!" Бацька мусіў па службовых справах часта едзіць у Беларускі камітэт у Беласток. Заўсёды адвозіў туды матэрыялы для беларускай газеты „Новая дарога". У гэтай газеце была спецыяльная рубрыка, прысвечаная працы школ. Па прапанове бацькі ў ёй друкаваліся матэрыялы з кнігі В. Біянкі „Лясная газета", якую ён завозіў у рэдакцыю. Гэтыя матэрыялы рэкамендаваліся настаўнікам для выкарыстання на ўроках.

Беларускія нацыянальныя дзеячы ў жахлівых умовах акупацыі імкнуліся скарыстаць любую магчымасць пашыраць беларускую культуру і нацыянальную самасвядомасць. Для многіх

вясковых дзяцей беларускія школы станавіліся важным этапам на іх жыццёвым шляху. Пасля прыходу Савецкай Арміі Васіль Сіткевіч працягваў сваю працу. Прыняў удзел у першай канферэнцыі настаўнікаў Скідзельскага раёна. А 23 жніўня 1944 г. быў арыштаваны органамі МДБ. У віну яму было пастаўлена супрацоўніцтва з акупантамі. Як узгадвае Юрый Сіткевіч, між іншым следчых цікавіла супрацоўніцтва яго бацькі з газетай „Новая дарога".

> Справа ў тым, што гэтая газета змяшчала вельмі вострыя сатырычныя вершы, аўтар якіх падпісваўся псеўданімам „Шэршань". Несумненна, гэта быў таленавіты аўтар. Яго вершы ў вёсках многія цыталі на памяць. А там была вельмі з'едлівая сатыра на Сталіна і савецкі лад, высмейваліся і мясцовыя парадкі. Следчыя падазравалі, што мой бацька і ёсць гэты самы „Шэршань". Справа ў тым, што адзін з сатырычных вершаў Шэршня быў прысвечаны падзеям у Скідзелі, калі мясцовыя паліцэйскія – пераважна імі былі палякі і расіяне-балахоўцы – дубінкамі збівалі мясцовых жыхароў, якія прыйшлі на беларускі канцэрт:
>
> Беларускі хор, балет,
> Песні, музыка і танцы.
> Уваход, аркестр, білет.
> Бачыш ты іх, галадранцы!
> Беларусь стварыць хацелі
> На адвечных польскіх землях!
> Хіба ім жыццё абрыдла?
> Беларусы, хамы, быдла.
>
> Ніякіх іншых злачынстваў бацькі следчым знайсці не ўдалося. Адзін з іх на допыце нават заявіў: „А почему ты не вступил в партизаны?". На гэта бацька адказаў, што тады б немцы знішчылі ўсю яго сям'ю. „Так что тебе дороже – Родина или семья?" – запытаўся следчы. „Сям'я", – адказаў бацька. У выніку атрымаў прысуд – 15 гадоў лагеру.

Васілю Сіткевічу давялося перажыць усе жахі сталінскага Гулагу. Ён пабываў у лагерах пад Новасібірскам, у Кемераўскай вобласці, апошнія гады правёў пад Карагандой. У Гулагу Васіль Сіткевіч напісаў вельмі пранізлівыя радкі на роднай мове, прысвечаныя сваёй сям'і.

Край мой любы, край мой родны,
Як ты міл і дораг мне,
А я змушаны тымчасам
На чужой жыць старане

Як жа хочацца да дому,
Дзе мой сын, дачка мая,
Дзе жыве мая падруга –
Жонка, мной любімая

Дзе наш сад, хацінка наша,
Дзе адзін старэнькі брат,
Дзе радзіўся, узгадаваўся я,
Дзе жыццю ўсяму быў рад

Дзе, калі ў канцы судзьбіна,
Дзён маіх скончыўшы лік,
Кажа легчы ў дамавіну –
Гэты страх не так вялік!

Там, дзе між сваімі лягу,
Там, дзе правядуць сваі
Там, дзе на маю магілу
Сваі ж пасыплюць горстачку зямлі

А сям'і сапраўды прыходзілася вельмі цяжка. Юрый Васільевіч Сіткевіч успамінае:

Мая маці вымушана была пераехаць з Раўкоў у вёску Шчанец, дзе выкладала нямецкую мову ў мясцовай школе. Я закончыў школу ў Скідзелі. Усе экзамены здаў на выдатна. Аднак, калі паўстала пытанне пра залаты медаль, дык абласны аддзел адукацыі не зацвердзіў (напэўна, па падказцы адпаведных органаў) пастановы педагагічнага савета школы. На жнівеньскай канферэнцыі настаўнікаў раёна некаторыя мясцовыя „дзеячы" гнеўна абвінавачвалі кіраўніцтва школы ў тым, што яно праявіла палітычную недальнабачнасць, вылучыўшы на атрыманне залатога медалю сына асуджанага савецкім судом. Тады дырэктар Скідзельскай школы Канстанцін Уладзіміравіч Махавікоў узняўся і рашуча заявіў: „Сын за бацьку не адказвае". А быў ён франтавіком, прыехаў у Беларусь са Стаўраполя. Медаль я так і не атрымаў. Паставілі чацвёрку за сачыненне. Але настаўнік Скідзельскай школы Іосіф Канстанцінавіч Мазалеўскі (у 1926–1930 гадах І. Мазалеўскі быў актыўным удзельнікам Скідзельскага гуртка ТБШ – С. Т.) усё роўна паставіў у атэстат усе пяцёркі. Я паспрабаваў паступіць у Беларускі дзяржаўны універсітэт і нават здаў на „выдатна" ўсе ўступныя экзамены. Пасля апошняга экзамена спытаў членаў так званай „мандатнай" камісіі: „Ці магу я на нешта спадзявацца?". Адзін з іх адказаў: „Спадзявацца трэба заўсёды". У БДУ мяне так і не прынялі, але па выніках мінскіх экзаменаў паступіў я на фізіка-матэматычны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута. У 1954 г. скончыў з адзнакай ін-

ститут і быў накіраваны на працу ў Сабакінскую (цяпер Першамайская) школу Васілішкаўскага раёна[10]. А ў наступным 1955 г. выйшаў з лагера на вольнае пасяленне мой бацька. Мы з маці ездзілі да яго ў Караганду. А ў 1956 г. бацька, дзякуючы хадайніцтву маці, вярнуўся дахаты. „Вось так аддзячыла савецкая ўлада мне за ўдзел у Скідзельскім паўстанні!" – часамі гаварыў ён. Да канца сваіх дзён бацька адчуваў ушчамленне сваіх правоў. У пенсіі па старасці яму было адмоўлена. Органы сацыяльнага забеспячэння абгрунтавалі адмову тым, што „работу за период с 1922 г. по 1941 г. комиссия по установлению трудового стажа не подтвердила". А бацька ж сабраў усе патрэбныя дакументы і пацвярджэнні сведкаў. Пасля смерці маці ён атрымліваў мізэрную пенсію, якая прадугледжвалася „ў выпадку страты кармільца". У рэабілітацыі ў часе „хрушчоўскай адлігі" бацьку таксама было адмоўлена. Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР так адказала 18 траўня 1964 г. на яго прашэнне: „Проверкой дела и материалов дополнительного расследования установлено, что за участие в антисоветской националистической организации «Белорусский комитет» и активную работу по воспитанию учащихся в антисоветском духе Вы осуждены обоснованно".

У 1957 г. завітаў да нас у Мастаўляны стары бацькаў сябар Піліп Кізевіч, які тады жыў у Беластоку і займаў там высокія дзяржаўныя пасады. Памёр бацька вясной 1970 г. Толькі ў 1990 г. быў цалкам рэабілітаваны.

Лёс Васіля Сіткевіча падобны да лёсу многіх беларускіх інтэлігентаў яго пакалення, якія атрымалі адукацыю яшчэ ў царскіх школах, а ў часе расійскай рэвалюцыі ці ўжо ў польскай дзяржаве далучыліся да нацыянальнага руху. Стваралі тонкі пласт адукаваных людзей у пераважна сялянскім беларускім грамадстве. Таму іх роля ў нацыянальнай культурна-асветнай працы была надзвычай важнай. І гэтую працу яны самаахвярна рабілі, нягледзячы на бясконцыя рэпрэсіі, на турмы і лагеры.

[10] Юрый Васільевіч Сіткевіч многія гады працаваў школьным настаўнікам, затым выкладчыкам Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. Цяпер на пенсіі, жыве ў Гародні.